**Сяргей ЕЛІЗАРАЎ**

# "Жыць стала лепей, таварышы": заработная плата работнікаў мясцовых органаў дзяржаўнай улады і кіравання ў БССР у 1930-я гг.

**Сучасная гістарыяграфія ўсё больш цікавіцца праблемамі штодзённасці, у тым ліку савецкай. Адны аўтары, працягваючы лінію савецкай гістарыяграфіі, спрабуюць акцэнтаваць увагу на дасягненнях савецкага ладу жыцця, адсутнасці значнага маёмаснага расслаення, рэальным росце дабрабыту савецкіх людзей, у тым ліку ўзроўню заработнай платы, пашырэнні даступнасці тавараў і паслуг і г. д. Іншыя ж, услед за прадстаўнікамі замежнай саветалогіі, апісваюць жабрацкае існаванне асноўнай масы насельніцтва СССР, ілюзорнасць роўнасці і "ўсеагульнай справядлівасці" ў савецкім грамадстве і наяўнасць "наменклатурнага багацця" партыйна-савецкай вертыкалі ўлады.**



**ЕЛІЗАРАЎ Сяргей Аляксандравіч.**

*Прафесар кафедры сацыяльна-гуманітарных і праваых дысцыплін Гомельскага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта імя П.В.Сухога, доктар гістарычных навук, прафесар. Нарадзіўся ў 1955 г. у Архангельску (Расія). У 1978 г. закончыў гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, у 1983 г. — аспірантуру БДУ. У 2013 г. абараніў доктарскую дысертацыю "Формирование и функционирование системы административно-территориального деления БССР (1919—1991 гг.)". Аўтар больш за 200 навуковых і метадычных публікацый, у тым ліку манаграфій "Формирование и функционирование системы административно-территориального деления БССР (1919—1991 гг.)" (Гомель, 2009), "Становление и развитие системы местных Советов БССР в 1919—1929 годах" (Гомель, 2016).*

Такія падыходы ўласцівыя не толькі публіцыстыцы (што для яе цалкам натуральна па характары жанру), але і некаторым навукоўцам, сярод якіх "першынство" яшчэ з канца 1980-х гг. займаюць зусім не гісторыкі, а сацыёлагі і палітолагі. У сучаснай масавай свядомасці пануюць транслюемыя сродкамі масавай інфармацыі спрошчаныя публіцыстычныя ідэалагемы, пабудаваныя па лёгка зразумелай масавым спажыўцом сітуацыйнай дуалістычнай схеме "праўда-хлусня", "дабро-зло", "добрае-дрэннае", "справядлівае-несправядлівае", "багаты-бедны", якія лёгка перабудоўваюцца ў залежнасці ад самых розных абставінаў — узроўню даверу да тых ці іншых крыніц інфармацыі, іх інтэнсіўнасці, ступені задаволенасці дзяржаўнай палітыкай у розных сферах жыцця, абставінамі асабістага жыцця і г. д.

На падставе апублікаваных статыстычных дадзеных і архіўных дакументаў Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўнага архіва Гомельскай вобласці паспрабуем паказаць асноўныя мерапрыемствы ўладаў БССР у галіне заработнай платы работнікаў мясцовых органаў дзяржаўнай улады і кіравання (у 1930-я гг. — гэта структуры акруговых, абласных і раённых выканкамаў, а таксама гарадскіх і сельскіх Саветаў), параўнаць узровень афіцыйнай аплаты іх працы з аплатай працы іншых катэгорый насельніцтва.

Складанасць аналізу гэтай праблемы шмат у чым абумоўлена непаўнатой і фрагментарнасцю статыстычных звестак, рознымі падыходамі ў вылучэнні груп савецкіх служачых у савецкай статыстыцы. Так, у статыстычным зборніку 1930 г. "Пытанні працы ў лічбах. Статыстычны даведнік за 1927—1930 гг." вылучаецца толькі ў цэлым група *"савецкія і гандлёвыя служачыя"* без іх дыферэнцыяцыі[1]. Выданне 1932 г. было дапоўнена раздзелам *"Сярэднямесячная заработная плата служачых асобных пасад сельскага адміністрацыйнага апарата ў лютым 1927 і ў студзені 1928, 1929 і 1930 гг. (у руб.)"*[2]. У афіцыйнай статыстыцы 1936 г. з'яўляецца гру-

па "дзяржаўныя адміністрацыйныя ўстановы", у склад якіх па мясцовых органах дзяржаўнай улады і кіравання БССР уваходзілі: па-першае, кіраўніцтва акруговае і раённае (прэзідыумы і аддзелы раённых і акруговых выканкамаў, а таксама пракуратура, упаўнаважаныя розных рэспубліканскіх ведамстваў), па-другое, гарсаветы і іх аддзелы, па-трэцяе, сельсаветы (старшыні і сакратары)[3].

Варта адзначыць, што большасць урадавых рашэнняў у 1930-я гг. па рэгуляванні заработнай платы мясцовай савецкай наменклатуры не публікаваліся, а рассылаліся пад грыфам "сакрэтна" і сёння захоўваюцца толькі ў архіўных фондах.

У дадзеным артыкуле пад паняццем "заработная плата" (заробак) разумеецца яе вызначэнне, дадзенае ў першым артыкуле Канвенцыі Міжнароднай арганізацыі працы № 95 ад 1 ліпеня 1949 г. "Аб ахове заработнай платы": *"У мэтах гэтай Канвенцыі тэрмін "заработная плата" азначае, незалежна ад назвы і метаду вылічэння, усялякае ўзнагароджанне або заробак, якія могуць быць вылічанымі ў грошах і ўстаноўленыя Пагадненнем, або нацыянальным заканадаўствам, якія прадпрымальнік павінен выплаціць, у сілу пісьмовай або вуснай дамовы аб найманні паслуг, працаўніку за працу, якая альбо выкананая, альбо павінна быць выкананая, або за паслугі, якія альбо аказаныя, альбо павінны быць аказаныя"*[4].

У другой палове 1920-х гг. заработная плата розных катэгорый працаўнікоў мясцовага савецкага дзяржаўнага апарату ўлады і кіравання (выканаўчых органаў мясцовых саветаў рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў як афіцыйных вышэйшых органаў улады і кіравання) расла, але нераўнамерна. Так, у БССР сярэднямесячны заробак старшыняў райвыканкамаў павялічыўся за 1927—1929 гг. на 50%, а старшыняў сельсаветаў — на 25%. Гэтыя паказчыкі ў асноўным адпавядалі тэмпам росту заробку работнікаў беларускіх раённых бюджэтных устаноў (раённых аграномаў — на 47%, сельскіх дактароў — на 38%, сельскіх настаўнікаў — на 31%)[5], але перавышалі тэмпы яе росту на вытворчых прадпрыемствах цэнзавай прамысловасці ў БССР (рост — 24%)[6].

Узровень аплаты працы работнікаў мясцовай вертыкалі ўлады і кіравання напрыканцы 1920-х гг. быў у цэлым адносна невысокім. У 1928/1929 гаспадарчым годзе сярэдні заробак рабочых цэнзавай фабрычна-завадской прамысловасці па БССР складаў 70,95 руб. у месяц (найбольш высокім ён быў у рабочых швейнай прамысловасці — 99,32 руб., гарбарнай прамысловасці — 98,80 руб., па апрацоўцы металаў — 98,07 руб., абутковай прамысловасці — 88,24 руб.), а старшыня беларускага райвыканкама (вышэйшая раённая савецкая наменклатурная адміністрацыйная пасада) атрымліваў 70 руб., старшыня і сакратар сельсавета — 28 руб.[7] Ды і ў саміх раёнах БССР шэраг спецыялістаў атрымлівалі заробак вышэй за райвыканкамаўскае кіраўніцтва: заробак раённага агранома у БССР складаў у месяц 100 руб., а вясковага доктара — 95 руб.[8]

З пачаткам масавай калектывізацыі, калі раёны станавіліся яе "вузлавымі пунктамі", а іх кіраўнікі — галоўнымі праваднікамі, заробак мясцовай вертыкалі ўлады значна ўзрос: у студзені 1930 г. у БССР старшыні райвыканкамаў атрымлівалі ўжо 114 руб. у месяц (рост у параўнанні са студзенем 1929 г. — на 23%), члены райвыканкамаў — 90,8 (на 33,5%), старшыні і сакратары сельсаветаў — 34 руб. (на 21%). Заробак рабочых таксама павялічыўся ў сярэднім да 83,23 руб., але яго рост складаў толькі 11%. На раённым узроўні ў БССР сярэдні месячны заробак усіх працаўнікоў райвыканкамаў (і адказных, і тэхнічных) выглядаў досыць прывабна — 56 руб. (рост — 26%). У іншых работнікаў адміністрацыйных устаноў раёна ён быў ніжэй: у судовых раённых органах (суддзі і следчыя, тэхнічны персанал) — 55,5 руб. (рост — 21%), у раённай міліцыі — 46,8 руб. (рост — 9%)[9].

У гэты час аплата працы часткі савецкіх наменклатурных кіраўнікоў ажыццяўлялася (як і раней) па тарыфах *"адказных палітычных работнікаў"*, да якіх у БССР па мясцовых саветах адносіліся старшыні і загадчыкі аддзеламі акруговых і раённых выканкамаў, старшыні гарадскіх саветаў, а таксама іх намеснікі. Чарговае палажэнне аб аплаце гэтай катэгорыі служачых было зацверджана наркаматам працы СССР 25 лістапада 1929 г.[10]. Афіцыйна ніякай іншай аплаты (акрамя як за творчую і выкладчыцкую дзейнасць) яны атрымліваць не мелі права. Аднак прадугледжвалася, што *"акрамя асноўных ставак для адказных палітработнікаў можа быць усталяваная дадатковая аплата ў адпаведнасці з перагружанасцю работніка, яго кваліфікацыяй і важнасцю або адказнасцю выкананай ім працы"*. У рэальнасці "магчымасць" станавілася звычайнай практыкай. Акрамя таго, згаданая пастанова вызначала памеры толькі мінімальнай асноўнай штомесячнай зарплаты, а верхні яе ўзровень афіцыйна абмяжоўваўся толькі аплатай па наступным разрадзе.

Улічваючы, што аплата працы адказным палітработнікам ўсталёўвалася мясцовымі акруговымі камісіямі, гэта стварала шырокія магчымасці для атрымання імі больш высокага заробку. Так, у Магілёўскай акрузе акруговая камісія ўстанавіла старшыні акрвыканкама зарплату ў 215 руб. (замест 110 руб. — мінімальнай па палажэнні), старшыні гарсавета, намеснікам старшыні акрвыканкама, загадчыкам акруговымі аддзеламі — 185 руб. (замест 100 руб.), сакратарам гарсавета — 160 руб. (замест 90 руб.), старшыням райвыканкамаў — 120 руб. (замест 85 руб.). У Гомельскай акрузе старшыні акрвыканкама і Гомельскага гарсавета вызначылі заробак у 225 руб., іх намеснікам — 200 руб., старшыням райвыканкамаў — 120—150 руб.[11] Аднак у прапагандысцкіх мэтах насельніцтву трансляваліся менавіта памеры заробку савецкіх кіраўнікоў без усіх дадатковых налічэнняў.

У выніку сакратар Цэнтральнага выканаўчага камітэта (ЦВК) БССР А.І.Хацкевіч у сваім дакладзе на III сесіі ЦВК БССР IX склікання (1930 г.) сцвярджаў, што ў пачатку 1930 г. старшыні райвыканкамаў атрымлівалі толькі па 100—110 руб.[12]

Падобная практыка ўносіла хаатычнасць і разнабой у зарплатную палітыку, парушала планавасць фінансавай працы, ствараючы глебу для парушэнняў фінансавай дысцыпліны і для асобасных канфліктаў паміж кіраўнікамі рознага ўзроўню і розных адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак. Яшчэ з 1927—1928 гг. у СССР пачалася новая тарыфная рэформа, якая павінна была павысіць значэнне тарыфнай стаўкі ў заробку і знізіць ролю розных каэфіцыентаў, даплат і прэмій. Планавалася ўніфікаваць зарплату і забяспечыць яе раўнамернае размеркаванне па адных і тых жа пасадах. Усё часцей стала прымяняцца прамое дзяржаўнае нармаванне заработнай платы з вызначэннем цвёрдых акладаў па бюджэце без выкарыстання разраднай сеткі. Такая сістэма ў большай ступені адпавядала інтарэсам палітыкі фарсіраванага будаўніцтва сацыялізму і выразна ўпісвалася ў строга цэнтралізаваную мадэль кіравання грамадствам.

У пачатку 1930-х гг. тарыф "адказных палітработнікаў" быў фактычна ліквідаваны. Рэгуляванне заробку кіраўнікоў савецкіх дзяржаўных органаў улады і кіравання стала ажыццяўляцца па-за тарыфнай сеткай адмысловымі рашэннямі саюзнага і рэспубліканскага ўрадаў. Адпаведна расла роля вышэйшага партыйнага і савецкага кіраўніцтва, якое магло павышаць зарплату асобных катэгорый насельніцтва кропкава (у тым ліку і кіруючых кадраў) без неабходнасці яе паўсюднага росту[13].

Да канца 1930 г. у выніку ліквідацыі акруговага дзялення былі перагледжаныя стаўкі аплаты працаўнікам мясцовай вертыкалі ўлады і кіравання. У снежні 1930 г. СНК БССР устанавіў новыя цвёрдыя стаўкі заробкаў старшыняў райвыканкамаў і сельсаветаў, загадчыкаў райаддзеламі, раённых інструктараў і інспектараў. Яны значна перавышалі ранейшыя заробкі мясцовых кіраўнікоў нават з улікам надбавак. У гарадскіх саветах старшыні сталі атрымліваць у месяц ад 100 руб. (Гарадок, Сянно, Ветка, Чэрвень, Чавусы, Чэрыкаў, Петрыкаў) да 200 руб. (Віцебск і Гомель) і 225 руб. (Менск), сакратары — ад 50 да 175 руб., загадчыкі аддзеламі (Менск, Віцебск, Гомель) — 175 руб., інспектары — ад 150 да 160 руб. У райвыканкамах старшыні атрымлівалі штомесяц ад 175 да 200 руб., сакратары — 150 руб., загадчыкі зямельнымі, фінансавымі і адміністрацыйнымі аддзеламі — 150 руб., інспектары — ад 130 да 140 руб. Месячны заробак старшыняў сельсаветаў вырас да 50 руб., сакратароў — да 45 руб.[14] Нягледзячы на скарачэнне акруговага апарату, за кошт павышэння заробку супрацоўнікаў райвыканкамаў і сельсаветаў выдаткі на ўтрыманне апарату мясцовых органаў улады і кіравання выраслі на 28%[15].

З гэтага моманту старшыня райвыканкама стаў самым высокааплатным савецкім служачым у раёне: менш за яго атрымлівалі ўжо і раённы аграном, і землеўпарадчык (па 160 руб.у месяц), і загадчык раённай бальніцай (150 руб.), і доктар (130 руб.)[16].

Сродкі на ўтрыманне райвыканкама і яго структурных адзінак займалі першае месца ў структуры выдаткаў на ўтрыманне ў цэлым усяго раённага кіраўнічага апарату. У 1931 г. сярэдні "кошт" аднаго раённага апарату складаў 236,5 тыс. руб., з іх на ўтрыманне райвыканкама вылучалася 71 тыс. руб. Потым ішлі райлеспрамгас — 43,3 тыс. руб., райспажыўсаюз — 34,6 тыс. руб., райкалгассаюз — 25 тыс. руб., райкаапсаюз — 21,3 тыс. руб., райбанкі — 21 тыс. руб., райкамы партыі — 9,5 тыс. руб. і г. д.[17]

Чарговае павышэнне аплаты працы савецкіх адміністрацыйных работнікаў адбылося ў 1932 г. і суправаджалася ўзмацненнем яе дыферэнцыяцыі ў залежнасці ад адміністрацыйнага значэння савецкага органа ўлады і кіравання ў сістэме ўладных прыярытэтаў, аб'ёмаў працы і сферы адказнасці. У рэчышчы кампаніі па ўмацаванні памежных раёнаў больш высокія заробкі ўсталёўваліся для служачых, якія працавалі ў адпаведных кіраўнічых структурах.

Рашэннем СНК БССР ад 6 лістапада 1931 г. на 1932 г. заробак старшыняў сельсаветаў падымаўся да 70 руб. у месяц (у памежных раёнах — 75 руб.), сакратароў — да 63 руб. Для старшыняў 30 памежных райвыканкамаў месячны аклад склаў 200 руб., для астатніх — 185 руб. Старшыні выканкамаў буйных і найбольш эканамічна развітых раёнаў сталі атрымліваць ад 215 руб. (Полацкі, Рэчыцкі і Мазырскі) да 225 руб. (Бабруйскі, Магілёўскі, Аршанскі і Барысаўскі). Менскі гарсавет па аплаце адказных работнікаў увайшоў у катэгорыю ўстаноў рэспубліканскага ўзроўню (старшыня — 260 руб., яго намеснік — 225 руб., сакратар — 200 руб.). Працаўнікі гарсаветаў Віцебска і Гомеля атрымлівалі па першай катэгорыі (старшыня — 240 руб., яго намеснік — 200 руб., сакратар — 185 руб.). Да другой катэгорыі былі аднесены Бабруйск, Магілёў, Орша і Барысаў (старшыня — 225 руб., яго намеснік — 200 руб., сакратар — 175 руб.), да трэцяй — Полацк, Мазыр і Рэчыца (старшыня 215 руб., намеснік — 185 руб., сакратар — 160 руб.)[18].

Для павышэння матэрыяльнай забяспечанасці работнікаў раённага і сельскага апаратаў 27 мая 1932 г. ЦВК БССР пастанавіў стварыць фонды прэміравання. За кошт артыкула "спецыяльныя асігнаванні" ў раённым бюджэце фарміраваўся адзіны фонд прэміравання раённых і сельскіх работнікаў *"за ўзорную працу і асаблівыя дасягненні на аснове сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, а таксама за вынаходніцтвы, тэхнічныя ўдасканаленні і рацыяналізатарскія прапановы"*. Фонд ствараўся за кошт адлічэння 0,5% гадавога фонду заробку ўсіх устаноў раёна, што знаходзіліся на мясцовым бюджэце, 0,25% ад сум прыбытку прадпрыемстваў мясцовага падпарадкавання і 50%

ад сум эканоміі ў выніку ўкаранення вынаходніцтваў і рацыяналізатарскіх прапаноў. Пры гэтым прэміі выдаваліся як грашыма, так і ў выглядзе прадастаўлення дадатковага адпачынку, месцаў у санаторыях і дамах адпачынку, камандзіровак па СССР[19].

Значная частка сродкаў з гэтых фондаў ішла на павышэнне матэрыяльнага становішча самай нізкааплатнай катэгорыі наменклатурных работнікаў — старшыняў сельсаветаў. Да асноўнага акладу ("пенсіі", як гэта ў той час называлася) некаторым з іх, *"улічваючы матэрыяльнае становішча кожнага, яго працу па выкананні палітыка-гаспадарчых кампаній і арганізацыйна-гаспадарчаму ўмацаванню калгасаў"*, райвыканкамы выплачвалі штомесячную датацыю. На канец 1932 г. яе атрымлівалі 165 старшыняў сельсаветаў (18,4% ад агульнай іх колькасці) на суму 7420 руб. у месяц (ад 10 да 100 руб. на чалавека). Датацыі атрымлівалі таксама 52 сакратары сельсавета на суму 1850 руб. у месяц (ад 10 да 100 руб.)[20].

А ў канцы лістапада 1933 г. рашэннем урада БССР аплата працы работнікаў сельсаветаў рэспублікі была ўжо афіцыйна значна павышана: у залежнасці ад колькасці насельніцтва сельсаветаў іх старшыні сталі атрымліваць ад 100 да 200 руб., сакратары — ад 80 да 160[21].

Чарговае павышэнне зарплаты старшыняў райвыканкамаў адбылося ў 1935 г. На аснове пастановы ЦВК і СНК СССР з 1 жніўня 1935 г. у БССР усталёўліваліся новыя дыферэнцыраваныя месячныя аклады старшыням райвыканкамаў: у 12 раёнах — па 450 руб., у 39 раёнах — па 400 руб., у 37 раёнах — па 375 руб. Стаўкі астатніх адказных і тэхнічных працаўнікоў райвыканкамаў заставаліся на ранейшым узроўні[22].

Усяго толькі праз паўгода адбылося новае павышэнне заробкаў старшыняў райвыканкамаў. Пастановай СНК СССР і ЦК УсеКП(б) ад 11 лютага 1936 г. з 1 лютага заробкі паловы старшыняў райвыканкамаў узраслі да 650 руб., у астатніх — да 550 руб., іх намеснікаў — адпаведна да 550 і 450 руб., кіраўнікоў раённых зямельных, фінансавых і гандлёвых аддзелаў — да 500 і 400 руб.[23] Такім чынам, за пяць гадоў (з 1931 па 1936 гг.) аплата працы кіруючага складу раённых органаў дзяржаўнай улады і кіравання вырасла ў сярэднім больш чым у тры разы і значна (за выключэннем сельсаветаў) пераўзыходзіла заробак радавых дзяржслужачых *(гл. табліцу 1)*.

Нават сярэднія паказчыкі аплаты працы ўсіх работнікаў акруговага (у 1935 г. у структуры адміністрацыйна-тэрытарыяльнага дзялення БССР з'явіліся чатыры памежныя акругі: Полацкая, Мазырская, Лепельская і Слуцкая) і раённага ўзроўняў (кіраўнікоў і радавых выканаўцаў) у БССР сведчаць, што больш за іх заробак атрымлівалі толькі 5,5% рабочых і служачых БССР. Афіцыйная статыстыка фіксавала: у сярэднім больш атрымлівалі у праектных арганізацыях, інстытутах і бюро (360 руб.), ВНУ (331 руб.), органах кіравання народнай гаспадаркай (255 руб.), грамадскіх арганізацыях (у тым ліку у прафсаюзах), навуковых таварыствах (226 руб.). Вышэй была і сярэдняя зарплата інжынерна-тэхнічных работнікаў у будаўніцтве (352 руб.), у буйной прамысловасці (344 руб.), рыбнай прамысловасці (316 руб.), МТС (317 руб.).

Абсалютная ж большасць рабочых і служачых рэспублікі (94,5%) атрымлівалі менш за сярэдні заробак работнікаў акруговых і раённых органаў улады і кіравання: рабочыя ў буйной прамысловасці — 175 руб., у дробнай — 132 руб., у будаўніцтве — 180 руб., у МТС — 178 руб., у саўгасах — 101 руб.; работнікі аховы здароўя — 176 руб., асветы — 166 руб., культуры — 139 руб. Сярод структурных падраздзяленняў акрвыканкамаў і райвыканкамаў найбольш высокай была сярэдняя зарплата ў працаўнікоў аддзелаў народнай адукацыі (222 руб.), менш за ўсё атрымлівалі ў аддзелах сацыяльнага забеспячэння (177 руб.)[25].

*Табліца 1*

**Сярэднямесячная зарплата ў дзяржаўных адміністрацыйных установах БССР (сакавік 1936 г., руб.)**[24]

| | Колькасць работнікаў | Заробак у месяц, руб. | % ад сярэднямесячнай зарплаты па БССР |
|---|---|---|---|
| Усяго па ўсіх галінах народнай гаспадаркі | 596 399 | 165 | 100 |
| у тым ліку: | | | |
| дзяржаўныя адміністрацыйныя ўстановы | 14 515 | 208 | 126,0 |
| у тым ліку: | | | |
| кіраванне цэнтральнае (саюзнае і рэспубліканскае) | 2294 | 283 | 171,5 |
| акруговае кіраванне і раённае* | 5898 | 218 | 132,1 |
| гарсаветы самастойных гарадоў** | 716 | 224 | 135,8 |
| гарсаветы гарадоў, падначаленых райвыканкамам** | 227 | 178 | 109,2 |
| сельсаветы | 5380 | 163 | 98,8 |

* Улічваліся прэзідыумы і аддзелы гарвыканкамаў і райвыканкамаў, а таксама іншыя ўстановы раённага і акруговага значэння (пракуратура, упаўнаважаныя камітэта нарыхтовак СНК і г. д.).

** Улічваліся аддзелы гарсаветаў і гарадскія аддзелы наркаматаў і рэспубліканскіх устаноў.

*Табліца 2*

**Цэны на калгасных рынках (студзень 1936 г.)**[26]

| Прадукты | Адзінка вымярэння | Гарады | У тым ліку Менск | Раённыя цэнтры (у сярэднім) |
|---|---|---|---|---|
| мука жытняя | капеек за кг | Ад 120 да 150 | 145 | 128 |
| бульба | \\-\\ | 20 | 27 | 14 |
| ялавічына | \\-\\ | 722 | 700 | 535 |
| бараніна | \\-\\ | 680 | 700 | 568 |
| свініна | \\-\\ | 844 | 950 | 773 |
| масла сметанковае | \\-\\ | 1839 | 1350 | 1586 |
| яйкі | капеек за дзясятак | 579 | 800 | 435 |
| малако | капеек за літр | 133 | 160 | 111 |

*Табліца 3*

**Заработная плата кіруючага складу аблвыканкамаў БССР (1940 г.) (руб. у месяц)**[29]

| Пасады / аблвыканкамы | Мінскі, Беластоцкі | Баранавіцкі, Брэсцкі, Вілейскі, Пінскі | Віцебскі, Гомельскі, Магілёўскі, Палесскі |
|---|---|---|---|
| старшыня | 1800 | 1600 | 1400 |
| намеснік старшыні, загадчык прамысловым аддзелам | 1200—1400 | 1000—1200 | 800—1000 |
| загадчыкі астатнімі аддзеламі | 1100—1200 | 900—1000 | 800—1000 |

Ва ўмовах фарсіраванага будаўніцтва сацыялізму праца савецкіх чыноўнікаў стымулявалася не толькі ідэалагічнымі і рэпрэсіўнымі сродкамі, але і матэрыяльнымі. І ўжо да сярэдзіны 1930-х гг. праца ў раённых і акруговых органах улады і кіравання стала з пункту гледжання ўзроўню зарплаты значна больш прывабнай, чым у канцы 1920-х гг. На наш погляд, важна ўлічваць, што такі заробак дзяржкіраўнікі атрымлівалі ў раёнах, дзе адсутнічала буйная прамысловасць, ВНУ, НДІ і праектныя арганізацыі з іх больш высокай аплатай працы. Але звычайна людзі параўноўваюць свой узровень матэрыяльнага дастатку з даходамі тых, хто іх акружае, мала звяртаючы ўвагу на тых, хто жыве і працуе ў іншых мясцовасцях і іншых умовах. Да таго ж для атрымання больш высокага заробку, які фіксаваўся статыстыкай, неабходна было не толькі змяніць месца жыхарства і месца працы, не толькі ўпісацца ў новую для большасці жыхароў раёнаў жыццёвую прастору вялікіх гарадоў, але і атрымаць вышэйшую (перш за ўсё — тэхнічную) адукацыю. А для работнікаў мясцовага звяна ўлады і кіравання такіх жорсткіх патрабаванняў не прад'яўлялася, што дазваляла і пры невысокім узроўні адукацыі і агульнай культуры адчуваць сябе паспяховым і матэрыяльна забяспечаным (у параўнанні з абсалютнай большасцю жыхароў раёнаў) чалавекам.

Да таго ж жыццё ў райцэнтрах патрабавала менш выдаткаў, чым у гарадах, асабліва буйных *(гл. табліцу 2)*, што рабіла рэальна "даражэй" заробак мясцовай наменклатуры.

Доўгі час (з 1933 г.) не павышаліся заробкі работнікаў сельсаветаў. Толькі 29 красавіка 1939 г. пастановай СНК СССР усталёўваліся новыя месячныя стаўкі аплаты працы старшыняў і сакратароў сельсаветаў. У пастанове асабліва падкрэслівалася, што гэтыя стаўкі *"цвёрдыя"* і *"не падлягаюць змене з боку мясцовых выканаўчых камітэтаў"*. Зарплата работнікаў дыферэнцыравалася ў залежнасці ад колькасці насельніцтва сельсавета: старшыняў — ад 150 да 300 руб., сакратароў — ад 125 да 200 руб.[27]

З'яўленне ў 1938 г. абласцей у БССР запатрабавала афіцыйнага афармлення ставак работнікаў абласнога апарата ўлады і кіравання. У чэрвені 1939 г. на аснове спецыяльнай пастановы СНК СССР "Аб заработнай плаце кіруючых работнікаў савецкіх рэспублік" (выдадзеным пад грыфам "сакрэтна") у рэспубліцы ўсталёўваўся заробак асноўным кіруючым работнікам аблвыканкамаў. Па ўзроўні заработнай платы Мінскі аблвыканкам быў аднесены да другой групы, Віцебскі, Гомельскі, Магілёўскі і Палескі — да чацвёртай[28].

У сакавіку 1940 г. СНК СССР у дадатак да папярэдняй пастановы (чэрвеньскай 1939 г.) устанавіў аплату працы работнікаў аблвыканкамаў Заходняй Беларусі. Беластоцкі аблвыканкам увайшоў у другую групу, астатнія (Баранавіцкі, Брэсцкі, Вілейскі, Пінскі) — у трэцюю.

У выніку заробак старшыняў Мінскага і Беластоцкага аблвыканкамаў толькі нязначна саступаў заробку старшыні беларускага ўрада (2000 руб.) і быў нават вышэй за зарплату рэспубліканскіх наркамаў (1600—1700 руб.) *(гл. табліцу 3)*.

А ў сакавіку 1940 г. былі зацверджаны і новыя стаўкі аплаты працы кіруючых савецкіх раённых работнікаў *(гл. табліцу 4)*.

*Табліца 4*

**Стаўкі заработнай платы кіруючых работнікаў райвыканкамаў БССР (сакавік 1940 г., руб. у месяц)[30].**

| Пасада/група* | 1 | 2 | 3 |
|---|---|---|---|
| старшыня | 1300 | 1100 | 1000 |
| намеснік старшыні | 1100 | 1000 | 950 |
| загадчык аддзелам (зямельным, народнай адукацыі, фінансавым, аховы здароўя, дарожным і мясцовай прамысловасці, сакратар райвыканкама, старшыня планавых камісій) | 800 | 700 | 600 |
| загадчык аддзелам (гандлю, сацыяльнага забеспячэння, камунальнай гаспадаркі) | 700 | 600 | 500 |

*Да першай групы было аднесена 20% усіх раёнаў рэспублікі, да другой — 30%, да трэцяй — 50%.

Безумоўна, ацаніць узровень матэрыяльнага дабрабыту розных катэгорый насельніцтва 1930-х гг. (і не толькі ў гэтыя гады) ва ўмовах савецкай рэчаіснасці, абапіраючыся толькі на афіцыйныя статыстычныя дадзеныя, вельмі складана. Нават у традыцыйнай рынкавай эканоміцы ўзровень заработнай платы не можа быць асноўным індыкатарам матэрыяльнага дабрабыту чалавека — істотную ролю адыгрываюць таксама рознага роду дывідэнды (ад акцый, біржавых аперацый, аперацый з уласнасцю і падобных рынкавых механізмаў). У савецкай сістэме цэнтралізаванага размеркавання заработная плата служыла фармальным паказчыкам магчымасці чалавека атрымаць вялікую або меншую частку тавараў і паслуг, якія вырабляліся грамадствам. Другі (нярэдка больш важны) аспект матэрыяльнага дабрабыту — гэта рэальная магчымасць такога атрымання ва ўмовах татальнага дэфіцыту, якая залежала ад сацыяльнага статусу чалавека і перш за ўсё яго прыналежнасці да той групы, якая размяркоўвала гэтыя тавары і паслугі.

У сувязі з гэтым узровень заработнай платы работнікаў мясцовага дзяржаўнага апарату ўлады і кіраўніцтва толькі часткова характарызуе іх матэрыяльнае становішча. Тым не менш можна адзначыць, што ў 1930-я гг. іх заработная плата расла значна больш высокімі тэмпамі, чым у цэлым усяго насельніцтва: уладная арыентацыя на першачарговы рост матэрыяльнага дабрабыту адміністрацыйна-кіраўнічых кадраў у гэтыя гады відавочная. Так, у БССР за 1930—1936 гг. заработная плата працаўнікоў раённага і акруговага звёнаў узрасла на 389%[31]. У той жа час сярэдні заробак па СССР (на жаль, аўтару не ўдалося знайсці адпаведных лічбаў па БССР) павялічыўся на 265%, работнікаў буйной прамысловасці — на 267%, будаўніцтва — на 246%, аховы здароўя — на 295%, асветы — на 206%[32].

Хуткаму росту заработнай платы савецкіх чыноўнікаў у значнай ступені спрыяў распачаты з канца 1920-х гг. пераход да палітыкі ўніфікацыі тарыфнай сістэмы і прамога дзяржаўнага нармавання заработнай платы, што прадугледжвала цэнтралізаванае вызначэнне цвёрдых акладаў па бюджэце без прымянення тарыфнай разраднай сеткі. Падобная практыка давала вярхушцы партыйна-савецкай улады магчымасць кропкавага рэгулявання заработнай платы асобных катэгорый работнікаў, у першую чаргу кіруючага апарату.

Ужо да сярэдзіны 1930-х гг. заработная плата савецкіх служачых органаў мясцовай дзяржаўнай улады і кіравання (раённых і акруговых выканкамаў, гарадскіх саветаў) значна перавышала ўзровень заработнай платы асноўных катэгорый насельніцтва. Улічваючы ў цэлым нізкі ўзровень матэрыяльнага дабрабыту насельніцтва (не толькі вяскоўцаў, але і жыхароў раённых цэнтраў), памеры афіцыйна атрыманай заработнай платы дазваляюць аднесці абласную, акруговую і раённую савецкую наменклатуру (за выключэннем яе самага масавага пласта — кіраўнікоў сельсаветаў) да найбольш забяспечаных катэгорый. І гэта нават пакідаючы па-за рамкамі даследавання наяўнасць розных ільгот і прывілеяў, формаў прамога або схаванага выкарыстання службовага становішча ў асабістых мэтах, якія атрымалі (нягледзячы на ўсе чысткі і рэпрэсіі 1937—1938 гг.) у гэтыя гады шырокае распаўсюджанне ў асяроддзі мясцовага кіраўніцтва.

Масавая калектывізацыя з паўсюдным выкарыстаннем карных метадаў і беззаконня спарадзіла ў многіх мясцовых кіраўнікоў пачуццё беспакаранасці. Асабліва шматлікія службовыя злачынствы фіксаваліся сярод старшыняў сельсаветаў. Галоўным чынам яны праяўляліся ў растратах і незаконнай канфіскацыі маёмасці ў калгаснікаў і аднаасобнікаў. У апошнім выпадку "схемы" злачынства была падобныя: на аднаасобнікаў накладаліся шматлікія незаконныя штрафы, якія пасля часткова або ў поўным аб'ёме прысвойваліся работнікамі сельсавета. Нярэдка старшыні сельсаветаў забіралі сабе і сабраныя падаткі.

У дакументах другой паловы 1930-х гг. утрымліваюцца шматлікія факты арганізацыі партыйнымі і савецкімі кіраўнікамі за кошт партыйных і дзяржаўных сродкаў банкетаў з нагоды разнастайных святаў, злётаў перадавікоў, канферэнцый, сходаў, якія часцяком выліваліся ў маштабныя п'янкі. У сістэму пакрыцця выдаткаў на правядзенне такіх "банкетаў" (у тым ліку дома ў кіраўнікоў раёнаў і акругаў) акрамя афіцыйна выдаткаваных сродкаў уключаліся: выкарыстанне грошай партыйнага і дзяржаўнага бюджэтаў шляхам выдзялення матэрыяльнай дапамогі асобам,

якія перадавалі пасля грошы арганізатарам гэтых мерапрыемстваў; выкарыстанне сродкаў прадпрыемстваў, арганізацый, калгасаў і саўгасаў; канфіскацыя прадуктаў у аднаасобнікаў, а таксама рознага роду фінансавыя махінацыі (напрыклад, выплата грошай за нявыкананыя работы). Нярэдка астатняя частка прадуктаў пасля завяршэння такіх "банкетаў" развозілася па дамах раённых кіраўнікоў. Шмат дакументаў сведчаць таксама аб растратах партыйных і дзяржаўных сродкаў на асабістыя мэты (рамонт кватэр, купля дываноў, адзення, прадуктаў харчавання, выдача святочных набораў кіруючым работнікам і г. д.).

Несумненна, гэта толькі папярэднія вынікі даследавання. Вывучэнне пастаўленай у ім праблемы патрабуе прыцягнення новых крыніц, а таксама выкарыстання эканоміка-матэматычных метадаў (дысперсны, карэляцыйны, рэгрэсіўны, фактарны і інш. аналізы), напрацовак сучаснай сацыялогіі і паліталогіі.

---

[1] Вопросы труда в цифрах. Статистический справочник за 1927—1930 гг. Москва, 1930.

[2] Труд в СССР. Экономико-статистический справочник. Москва-Ленинград, 1932.

[3] Численность и заработная плата рабочих и служащих в СССР. Итоги единовременного учета за март 1936 г. Москва, 1936; Труд в СССР: Статистический справочник. Москва, 1936.

[4] Конвенция Международной организации труда N 95 относительно защиты заработной платы (Женева, 1 июля 1949 г.) [Электронны рэсурс]. Рэжым доступу: http://constitution.garant.ru/act/right/megdunar/2540465/chapter/1cafb24d049dcd1e7707a22d98e9858f/. Дата доступу: 02.07.2018.

[5] Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (далей — НАРБ). Ф.4п, воп. 1, спр. 4760, арк. 36.

[6] Труд в СССР. Экономико-статистический справочник. С. 130.

[7] Белорусская ССР в цифрах. К 10-летию существования БССР. 1919—1929. Минск, 1929. С. 332—333.

[8] НАРБ. Ф. 4п, воп. 1, спр. 4760, арк. 36.

[9] Труд в СССР. Экономико-статистический справочник. С. 138, 148.

[10] НАРБ. Ф. 44, воп. 1, спр. 1829, арк. 57 — 60 адв.

[11] Елізараў С.А. Тарыф "адказны": рэгуляванне заработнай платы кіруючых кадраў савецкага дзяржаўнага апарату ў БССР (1930 гг.) // Беларускі гістарычны часопіс. 2020. № 2. С. 27.

[12] Хацкевіч А. Ліквідацыя акруг і ўзмацненне раённага і сельскага апаратаў // Соцыялістычнае будаўніцтва. 1930. № 11—12. С. 143.

[13] Там жа. С. 28.

[14] Дзяржаўны архіў Гомельскай вобласці (далей — ДАГВ). Ф. 296, воп. 1, спр. 186, арк. 182—183.

[15] Хацкевіч А. Ліквідацыя акруг і ўзмацненне раённага і сельскага апаратаў. С. 143.

[16] Там жа.

[17] НАРБ. Ф. 6, воп. 1, спр. 2432, арк. 64.

[18] ДАГВ. Ф. 208, воп. 1, спр. 892, арк. 330—331.

[19] ДАГВ. Ф. 296, воп. 1, спр. 231, арк. 41адв.

[20] НАРБ. Ф. 4п., воп. 1, спр. 6147, арк. 37—38.

[21] ДАГВ. Ф. 296, воп. 1, спр. 351, арк. 4.

[22] Зборнік законаў БССР. 1935. № 34. Паст. 182.

[23] НАРБ. Ф. 4п., воп. 1, спр. 10806, арк. 22.

[24] Складзена па: Численность и заработная плата (рабочих и служачих в СССР). С. 20—21.

[25] Численность и заработная плата (рабочих и служачих в СССР). С. 150, 152, 154, 250, 257, 264, 271.

[26] Складзена па: НАРБ. Ф. 4п., воп. 1, спр. 11726, арк. 29—38.

[27] ДАГВ. Ф. 1040, воп. 1, спр. 184, арк. 43.

[28] ДАГВ. Ф. 1230, воп. 1, спр. 18, арк. 71—78.

[29] Складзена па: ДАГВ. Ф. 1230, воп. 1, спр. 18, арк. 71—78; Ф. 1174, воп. 1, спр. 8, арк. 115.

[30] ДАГВ. Ф. 1174, воп. 1, спр. 8, арк. 117—117адв.

[31] Падлічана па: Труд в СССР. С. 148; Численность и заработная плата (рабочих и служачих в СССР). С. 20.

[32] Падлічана па: Численность и заработная плата (рабочих и служачих в СССР). С. 9—12; Труд в СССР. С. 17.